# Историография

# Гістарыяграфія

# Historiography

УДК 930.2

## ПРАСАПАГРАФІЯ: ГІСТОРЫЯ СТАНАЎЛЕННЯ І РАЗВІЦЦЯ МЕТАДУ

***С. А. ГАНЧАРЭНКА***[1*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

Даецца вызначэнне прасапаграфіі як метаду гістарычнага даследавання, акрэсліваюцца праблемы, якія ўскладняюць яго цэласнае разуменне. Усебакова разглядаюцца прычыны і ўмовы з'яўлення гэтага метаду ў сусветнай гістарыяграфіі, асноўныя этапы яго станаўлення і развіцця. Аналізуюцца працы навукоўцаў, якія сталі ля вытокаў прасапаграфіі. Зроблена выснова аб яго патэнцыйнай карысці пры даследаванні праблем айчыннай гісторыі.

***Ключавыя словы:*** метад; прасапаграфія; прасапаграфічны метад; біяграфія; біяграфічны метад; гістарыяграфія; сацыяльная гісторыя; Л. Стоўн; Л. Нэмір; Р. Сайм; Р. К. Мертан.

## ПРОСОПОГРАФИЯ: ИСТОРИЯ СТАНОВЛЕНИЯ И РАЗВИТИЯ МЕТОДА

***С. А. ГОНЧАРЕНКО***[1)]

[1)]*Белорусский государственный университет,*
*пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

Дается определение просопографии как метода исторического исследования, затрагиваются проблемы, усложняющее его целостное понимание. Всесторонне рассматриваются причины и условия возникновения этого метода

**Образец цитирования:**
Ганчарэнка С. А. Прасапаграфія: гісторыя станаўлення і развіцця метаду // Часоп. Беларус. дзярж. ун-та. Гісторыя. 2017. № 3. С. 94–100.

**For citation:**
Hancharenka S. A. Prosopography: the history of the formation and development of the method. *J. Belarus. State Univ. Hist.* 2017. No. 3. P. 94–100 (in Belarus.).

**Автор:**
***Сергей Александрович Гончаренко*** – аспирант кафедры истории Беларуси древних времен и средних веков исторического факультета. Научный руководитель – кандидат исторических наук, доцент А. В. Любый.

**Author:**
***Siarhei A. Hancharenka***, postgraduate student at the department of Belarus history of the ancient time and the middle ages, faculty of history.
*hanczarenka@gmail.com*

в мировой историографии, основные этапы его становления и развития. Анализируются труды ученых, стоящих у истоков просопографии. Сделан вывод о ее потенциальной пользе при исследовании проблем отечественной истории.

***Ключевые слова:*** метод; просопография; просопографический метод; биография; биографический метод; историография; социальная история; Л. Стоун; Л. Немир; Р. Сайм; Р. К. Мертон.

# PROSOPOGRAPHY: THE HISTORY OF THE FORMATION AND DEVELOPMENT OF THE METHOD

***S. A. HANCHARENKA***[a]

[a]*Belarusian State University, Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Belarus*

The article defines prosopography as a method of historical research, analyzes problems that complicate its holistic understanding. The reasons and conditions of the appearance of the prosopographical method, the main stages of its formation and development in historiography are considered. The works of the authors – founders of the method – are carefully analyzed. A conclusion is made about the potential usefulness of prosopography in the study of the problems of the history of Belarus.

***Key words:*** method; prosopography; prosopographic method; biography; biographical method; historiography; social history; L. Stone; L. Namier; R. Syme; R. K. Merton.

За больш чым 25 гадоў існавання незалежнай беларускай дзяржавы айчынныя навукоўцы дасягнулі значных поспехаў у даследаванні самых розных праблем гісторыі Беларусі. Фактычна на ранейшым падмурку паўстала новая нацыянальная гістарычная школа, былі напісаны арыгінальныя і важныя для навукі працы, назапашаныя веды акумуляваліся ў грунтоўных абагульняючых выданнях. На дадзены момант можна канстатаваць, што беларускія даследчыкі справіліся з найважнейшай задачай закрыцця так званых белых плям у гісторыі Беларусі, у сувязі з чым узнікае пытанне аб выкарыстанні новых падыходаў і метадаў у вывучэнні мінулага. Адным з іх з'яўляецца прасапаграфія. Мэта дадзенага артыкула – вызначыць прычыны і ўмовы фарміравання прасапаграфічнага метаду ў сусветнай гістарыяграфіі, асноўныя этапы яго складвання і развіцця.

У гістарычнай навуцы не існуе адзінага прынятага вызначэння прасапаграфіі. Хутчэй наадварот, у дадзеным пытанні сярод гісторыкаў пануе плюралізм меркаванняў. Пры неабходнасці акрэсліць сутнасць прасапаграфіі даследчыкі, як правіла, выкарыстоўваюць адзін з двух падыходаў. Першы заключаецца ў імкненні даць гэтаму метаду азначэнне, якое грунтуецца на ўласным досведзе яго выкарыстання. Другі – у цытаванні найбольш вядомага тлумачэння прасапаграфіі, прапанаванага брытанскім даследчыкам Л. Стоўнам у 1971 г.: «Прасапаграфія – гэта даследаванне біяграфічных характарыстык групы асоб у гісторыі шляхам калектыўнага вывучэння іх жыцця»[1] [1, p. 46]. Аднак часам нават тыя, хто звяртаецца да гэтага азначэння, прызнаюць, што яно значна састарэла.

Такі плюралізм меркаванняў і разнастайнасць стратэгій у падыходах да тлумачэння прасапаграфіі вынікае з гісторыі развіцця і прыроды гэтага метаду. Па-першае, ён узнік нашмат раней, чым адпаведны тэрмін, доўгі час існаваў у выглядзе збору і арганізацыі біяграфічных даных згодна з загадзя вызначанымі крытэрыямі. Толькі адносна нядаўна прасапаграфія пачала набываць тэарэтычныя абрысы [2, p. 18]. Па-другое, метад не з'яўляецца строгім наборам прадпісанняў, якіх кожны гісторык мусіць няўхільна прытрымлівацца. Прасапаграфія – гэта сукупнасць пэўных тэхнік, якія значна трансфармуюцца ў руках кожнага, хто да іх звяртаецца, бо залежаць ад мэты працы, перыяду, які даследуецца, прасапаграфічнай выбаркі канкрэтнай групы і апытальніка, што выкарыстоўваецца ў дачыненні да яе. Падобны стан нават выклікаў спрэчкі сярод гісторыкаў пра тое, ці з'яўляецца наогул прасапаграфія самастойным метадам [2, p. 3–5, 20, 25–26; 3, p. 156; 4, p. 37].

Спецыфіка прасапаграфіі вымусіла сучасных гісторыкаў падысці да яе вызначэння з іншага боку і вылучыць ключавыя ідэі, характэрныя для кожнага такога даследавання, незалежна ад яго мэты, прадмета і перыяду, які ў ім вывучаецца. Так, метаду прасапаграфіі ўласцівыя наступныя атрыбуты: біяграфічны і групавы аспекты, знешнія біяграфічныя характарыстыкі, базы даных і іх апрацоўка [4, p. 39]. Такім чынам, прасапаграфія звяртаецца ў першую чаргу да інфармацыі біяграфічнага

[1]Тут і далей пераклад наш. – *С. Г.*

характару, якая, аднак, датычыцца не адной асобы, а загадзя вызначанай паводле нейкага крытэрыю (крытэрыяў) дастаткова вялікай групы асоб. Даследчыка цікавіць не ўнутраны свет людзей, што ўвайшлі ў выбарку, не іх суб'ектыўныя думкі і пачуцці, інакш кажучы, не тое, што з'яўляецца ўнікальным, а знешнія характарыстыкі, якія назіраюцца ў кожнага прадстаўніка групы: паходжанне, роднасныя і сваяцкія адносіны, адукацыя, кар'ера, сацыяльны статус, прыналежнасць да сацыяльных груп, рэлігія і г. д. Уся сабраная даследчыкам інфармацыя арганізоўваецца ў выглядзе базы даных для далейшага аналізу з мэтай выяўлення істотных карэляцый. Прасапаграфія шчыльна звязана з такімі дапаможнымі навукамі і паддысцыплінамі, як біяграфія, анамастыка, генеалогія і сацыяграфія [2, p. 16–18; 4, p. 38, 40–41].

Метад мае працяглую гісторыю развіцця, якая выразна адлюстроўвае тыя змены, што адбываліся ў гістарычнай навуцы англасаксонскіх краін і краін кантынентальнай Еўропы з канца XIX ст. па цяперашні час. Само слова «прасапаграфія» паходзіць з грэчаскай мовы і літаральна перакладаецца як «апісанне знешніх індывідуальных характарыстык» [2, p. 4; 4, p. 36–37]. У 1971 г. Л. Стоўн адшукаў прыклад ужывання гэтага тэрміна ў 1743 г., аднак, як выяўляецца, слова мае яшчэ больш працяглую гісторыю. У XVI–XIX стст. яно адносілася да апісання знешніх характарыстык чалавека, радзей – яго свядомасці і маральных якасцей [1, p. 73; 5, p. 71–74].

Працэс станаўлення прасапаграфіі як метаду гістарычнага даследавання цягнуўся больш чым тры дзесяцігоддзі і складаўся з двух этапаў. Ужо традыцыйна пачынальнікам першага этапа і адначасова ўсяго прасапаграфічнага метаду лічыцца выдатны нямецкі гісторык-антыказнаўца Т. Момзен. Ён з'яўляецца ініцыятарам стварэння найстарэйшай у свеце працы ў межах прасапаграфіі – «Прасапаграфія Рымскай імперыі» (*Prosopographia Imperii Romani*), першае выданне якой было завершана ў 1898 г., а другое – толькі ў 2015 г. [2, p. 4; 5–7]. Дадзеная праца ўяўляе сабой біяграфічны слоўнік, які змяшчае звесткі пра ўсіх адносна значных асоб Рымскай імперыі ад бітвы пры Акцыуме ў 31 г. да н. э. да часоў кіравання імператара Дыяклетыяна. Момзен лічыў, што для разумення гісторыі імперскага Рыма недастаткова вывучэння яго палітычных інстытутаў, бо цэнтрам прыняцця рашэнняў з'яўляліся не яны, а імператар і яго бліжэйшае атачэнне. Гэтым абумоўлена яго выключная цікавасць да кар'еры імперскіх эліт [4, p. 42–43; 8]. Даследчыкі прызнаюць вялікае значэнне ў станаўленні прасапаграфіі не толькі выдання «Прасапаграфія Рымскай імперыі» і іншых падобных праектаў, якія запачаткаваў Т. Момзен, але і вядомай энцыклапедыі класічнай Антычнасці «Рэальная энцыклапедыя Паўлі-Вісова» (*Pauly-Wissowa Realencyclopädie*, 1894–1978), якая разам з дадаткамі налічвае больш за сто тамоў [4, p. 43; 9]. Нягледзячы на тое што падобныя біяграфічныя энцыклапедыі ў канцы XIX ст. ужо не былі вялікай рэдкасцю, менавіта даследчыкі Антычнасці першымі звярнулі ўвагу на значэнне групавога даследавання біяграфій палітычных эліт, якія валодалі рэальнымі, але нефармальнымі механізмамі ўлады.

Варта таксама адзначыць вялікую ролю, якую для з'яўлення першых прасапаграфічных даследаванняў адыгрывала назапашванне на працягу XVIII–XIX стст. біяграфічных даных самага рознага характару. Першыя працы ў рэчышчы прасапаграфіі былі б немагчымыя без вялікай колькасці біяграфічных энцыклапедый, слоўнікаў, спісаў ураднікаў, імён і г. д., якія актыўна друкаваліся па ўсёй Еўропе ў XIX ст. і працягваюць выдавацца сёння [10–13]. Менавіта падобныя працы далі надзвычай вялікі аб'ём хаця і недасканалага, але каштоўнага матэрыялу для першых прасапаграфічных даследаванняў [1, p. 48–49].

Прасапаграфія, такім чынам, не толькі ў межах гісторыі Антычнасці, але і адносна іншых перыядаў развівалася па адной схеме. Спачатку з'яўляліся шматлікія біяграфічныя слоўнікі, разнастайныя спісы ўраднікаў, якія пазней служылі базай для ўласна аналітычнага прасапаграфічнага даследавання. Прамежкавым звяном паміж першым і другім этапамі стала дзейнасць амерыканскіх даследчыкаў Ч. Бірда і А. П. Ньютана, чые працы пабачылі свет напярэдадні Першай сусветнай вайны. Аўтары яшчэ не мэтанакіравана, а хутчэй інтуітыўна, выкарыстоўвалі тое, што ў будучыні атрымала назву прасапаграфічнага метаду [14–15]. Сапраўднымі яго заснавальнікамі варта лічыць трох даследчыкаў: брытанскіх гісторыкаў сэра Л. Нэміра і сэра Р. Сайма, а таксама амерыканскага сацыёлага Р. К. Мертана. Няцяжка заўважыць, што прасапаграфічны метад нарадзіўся і рабіў першыя крокі ў межах англасаксонскай гістарычнай навукі [1, p. 50–51; 4, p. 43].

Сэр Л. Нэмір, выдатны брытанскі гісторык польска-яўрэйскага паходжання, упершыню выкарыстаў новы падыход да вывучэння палітычных эліт Брытаніі ў працы «Структура палітыкі падчас уступлення на трон Георга III» (далей – «Структура палітыкі»), якая пабачыла свет у 1929 г. [16]. Гэта даследаванне, напісанае аўтарам як пэўнае адступленне ад яго галоўнай сферы зацікаўленасці – Амерыканскай рэвалюцыі, – стала пачаткам з'явы, якую часам называюць «нэміраўская рэвалюцыя». «Структура палітыкі», безумоўна, была наватарскай працай і цалкам укладалася ў рэчышча таго метадалагічнага перавароту ў гістарыяграфіі, які разгарнуўся пасля Першай сусветнай вайны. Абсалютна чужую школе «Аналаў» працу Нэміра яднаў з ідэямі французскіх гісторыкаў-наватараў пратэст супраць пануючых метадаў і жанраў гістарычнага

даследавання. У прадмове да першага выдання аўтар падрабязна апісаў, як разгортваліся яго інтэлектуальныя пошукі. Так, узяўшыся за вывучэнне брытанскай «палітычнай нацыі» напярэдадні Амерыканскай рэвалюцыі, Нэмір зразумеў, што яго высновы не ўкладаюцца ў традыцыйнае бачанне англійскай палітыкі XVIII ст. як першага «партыйнага» стагоддзя: дагэтуль палітычная гісторыя перыяду кіравання Георга III даследавалася ў межах ідэйнага змагання Вігаў і Торы ў Палаце абшчын. Аднак брытанскі даследчык рашуча сцвердзіў, што ні першых, ні другіх у тым разуменні, якое надавалі ім гісторыкі XIX – пачатку XX ст., папросту не існавала. Замест вывучэння партыйнай гісторыі Брытаніі ён правёў хранагалагічны разрэз на моманце ўступлення на трон Георга III і паспрабаваў даследаваць прыхаваныя палітычныя механізмы таго часу, задаючыся фундаментальнымі пытаннямі: навошта людзі сярэдзіны XVIII ст. ішлі ў палітыку; што яны атрымлівалі ад палітыкі; якімі матывамі пры прыняцці тых ці іншых рашэнняў кіраваліся; якія фактары вызначалі паводзіны асобных дэпутатаў Палаты абшчын? Велізарнае значэнне для інтэрпрэтацыі палітыкі было нададзена вывучэнню асабістых прыярытэтаў эліты; сямейным і родавым сувязям; эканамічным інтарэсам; сетцы нефармальных паслуг, якія палітыкі аказвалі і атрымлівалі. Новы метад дазволіў не толькі па-новаму зірнуць на палітычную гісторыю сярэдзіны XVIII ст., але і на 20 гадоў прадвызначыў напрамак працы для многіх даследчыкаў палітычнай гісторыі Брытаніі ранняга Новага часу [1, p. 50–51; 16, p. IX–XIV; 17].

На гістарыяграфію Антычнасці значны ўплыў мела знакамітая праца сэра Р. Сайма «Рымская рэвалюцыя», якая пабачыла свет у 1939 г. [18]. Нягледзячы на тое што даследаванні Нэміра і Сайма выйшлі з розніцай у 10 гадоў, апошні, карыстаючыся метадамі, надзвычай падобнымі да тых, якія ўжываліся ў працы «Структура палітыкі», не быў з ёй знаёмы. Падобнае супадзенне тлумачыцца самой навуковай атмасферай у Вялікабрытаніі пасля Першай сусветнай вайны. Асноўнымі складнікамі гэтай атмасферы былі распаўсюджанне сярод гісторыкаў перакanання ў інтэлектуальнай абмежаванасці і вычарпанасці падыходаў, якія з'явіліся і дасягнулі росквіту ў XIX ст.; пашырэнне культурнага рэлятывізму; апантанасць праблемамі сям'і, роднаснымі і сваяцкімі адносінамі; заняпад даверу да палітыкаў і палітыкі ў грамадстве. Апошні фактар быў істотным стымулам як для Нэміра, так і для Сайма шукаць прыхаваныя механізмы палітыкі замест традыцыйнага аналізу інстытутаў права і дыпламатыі [1, p. 52–55].

У цэнтры ўвагі ў працы «Рымская рэвалюцыя» – гісторыя ўзнікнення і ўсталявання новага імперскага ладу ў Рымскай імперыі. Даследчык разглядаў працэсы трансфармацыі дзяржавы і грамадства ў перыяд ад 60 г. да н. э. да 14 г. н. э. [18, p. VII]. Аднак гісторык даследаваў не традыцыйныя біяграфіі вялікіх асоб, не ход найбольш значных бітваў, дыпламатычных перагавораў і г. д., а такія з'явы, як адносіны роднасці і сваяцтва паміж рымскімі і італійскімі фаміліямі; супольныя, часта матэрыяльныя, інтарэсы розных уплывовых рэспубліканскіх і імперскіх родаў, якія, на яго думку, і былі галоўным рухавіком палітычных падзей. Найважнейшую ролю ў палітычным жыцці Рыма аўтар адводзіць родавым кааліцыям і патранальна-кліентарным сістэмам. Такое бачанне вымусіла Сайма сканцэнтраваць увагу «не на асобе і ўчынках Аўгуста, а на яго прыхільніках», пры гэтым даследчык лічыў, што «структура ўрадавай эліты з'яўляецца ключавой праблемай палітычнай гісторыі» [18, p. VII–IX].

Выкарыстанне новага метаду дазволіла гісторыку кардынальна пераацаніць палітычныя працэсы перыяду ўсталявання і эвалюцыі прынцыпату Актавіана Аўгуста. Як і Нэмір, Сайм стаяў ля вытокаў цэлага напрамку ў гістарыяграфіі, у дадзеным выпадку – гістарыяграфіі Антычнасці [3, p. 156]. Варта таксама адзначыць, што праца «Рымская рэвалюцыя», напісаная «песімістычным і з'едлівым тонам» з «пазбяганнем метафар і абстракцый», мае вялікую літаратурную вартасць [18, p. VIII; 19]. Унёсак Сайма ў даследаванне гісторыі Антычнасці дазволіў складальніку яго некралога ў 1989 г. назваць навукоўца «найбольш уплывовым антыказнаўцам стагоддзя» [20].

Праца «Навука, тэхналогіі і грамадства ў Англіі XVII стагоддзя» Р. К. Мертана, выдатнага амерыканскага даследчыка, аднаго з заснавальнікаў сучаснай сацыялогіі, істотна адрозніваецца ад прац Нэміра і Сайма ў плане тэматыкі і метадалогіі [21, p. 362–366]. Так, англійскія навукоўцы былі зацікаўлены перадусім у даследаванні палітычнай гісторыі, а Мертан вывучаў праблему прычын узнікнення і распаўсюджвання выключнай увагі да натуральных навук у Англіі ў XVII ст. Пры гэтым прыклад Англіі з'яўляецца толькі матэрыялам для пастаноўкі яшчэ больш фундаментальнага пытання. Даследчык спрабуе выявіць сацыяльныя прычыны і механізмы, якія прадвызначаюць пераважнае развіццё ў пэўны перыяд ці эпоху нейкай сферы чалавечай культуры, актыўнасці. Ён задаецца пытаннем: чаму інтэлектуалы Англіі ў XVII ст. масава пачалі цікавіцца менавіта натуральнымі навукамі? Іншымі словамі, «якія сацыяльныя фактары сталі прычынай паўстання сучаснай навукі і тэхналогій?» [21, p. 362–366].

Спрабуючы адказаць на гэтыя пытанні, Мертан не даследаваў загадзя вызначаную паводле выразных крытэрыяў групу асоб, а зрабіў выпадковую выбарку адносна невялікай колькасці біяграфій з брытанскага «Слоўніка нацыянальных біяграфій» і ўжыў у дачыненні да яе строгі апытальнік. Гэты

падыход у большай ступені мае статыстычны характар. Нэмір і Сайм дакладна ведалі біяграфіі асоб, якія траплялі ў выбаркі, іх сувязі паміж сабой і з канкрэтнымі палітычнымі падзеямі. Больш за тое, групавы партрэт, створаны пры дапамозе прасапаграфіі, мусіў даць новую інтэрпрэтацыю палітычных і сацыяльных працэсаў. Мертана, у сваю чаргу, не цікавілі падрабязныя біяграфіі асоб. Ён паспрабаваў высветліць, якім чынам пэўны тып свядомасці англічан XVII ст. уплываў на іх стаўленне да натуральных навук, і выяўляў у выніку пазітыўную карэляцыю паміж уздымам пурытанізму і ранняй эксперыментальнай навукай [21, p. 367–397, 596–597; 22].

Працы Сайма і ў яшчэ большай ступені Нэміра мелі каласальны ўплыў на наступнае пакаленне гісторыкаў, які ў поўнай меры выявіўся толькі пасля Другой сусветнай вайны. Зрэшты, сам тэрмін «прасапаграфія» не быў агульнапрынятым яшчэ на пачатку 1970-х гг. Яго распаўсюджванню паспрыяў аўтарытэт Л. Стоўна, які выказваўся за пашырэнне гэтага тэрміна сярод гісторыкаў па прычыне яго трапнасці і лаканічнасці [1, p. 46, 51–52, 73]. Вельмі паказальнай у гэтым плане з'яўляецца вядомая праца па прасапаграфіі гісторыка Антычнасці Т. Ф. Кэрні, якая пабачыла свет у 1973 г. Аўтар ужо ў першым сказе акрэсліваў артыкул Стоўна як класічны, нягледзячы на тое, што крыху далей па тэксце ўступіў у палеміку з даследчыкам па многіх пытаннях [3]. Грунтоўныя і надзвычай уплывовыя публікацыі Стоўна і Кэрні абазначылі заканчэнне пэўнага этапу ў развіцці прасапаграфіі: фактычна яна была прызнана самастойным метадам даследавання, які патрабуе асобнай тэарэтычнай рэфлексіі.

Гісторыкі Л. Нэмір, Р. Сайм і Р. К. Мертан не толькі заклалі асновы новага метадалагічнага падыходу ў гістарыяграфіі, але і акрэслілі два кірункі яго развіцця. Першы, заснаваны Нэмірам і Саймам, мае больш традыцыйны характар. Прадметам даследавання ў працах дадзенага напрамку выступаюць, як правіла, эліты: уладныя, палітычныя, сацыяльныя, культурныя і г. д. Прасапаграфічная частка суправаджаецца ўважлівым вывучэннем канкрэтнага перыяду, пэўнай праблемы. Крыніцы з'яўляюцца пераважна наратыўнымі. Выбарка асоб для прасапаграфіі адносна невялікая, апытальнік дастаткова падрабязны. Сама прасапаграфія нярэдка выступае толькі як частка больш шырокага даследавання. У 1971 г. Л. Стоўн акрэсліваў дадзены кірунак як «элітарную школу», аднак час паказаў, што пры дастатковай колькасці крыніц ён можа быць пашыраны, хоць варта прызнаць, што эліты і палітычная гісторыя па-ранейшаму застаюцца галоўным аб'ектам цікавасці прыхільнікаў напрамку [1, p. 47, 69; 2, p. 10–11; 4, p. 42]. Часам гэта мае адваротныя бакі: даследчыкі, якія працуюць у межах такога падыходу, схільныя бачыць гістарычны працэс як змаганне палітычных груповак, аб'яднаных роднаснымі і матэрыяльнымі інтарэсамі, а само змаганне апісваюць спрошчана, як «гульню з нулявой сумай» [3, p. 168].

Другі напрамак – «масавая школа» – мае больш квантытатыўны характар і шмат у чым абавязаны сваім існаваннем сацыяльным навукам. Прасапаграфічная выбарка ў ім значна шырэйшая; вельмі часта пра асоб, якія ў яе ўваходзяць, не захавалася амаль ніякіх біяграфічных звестак, бо яны не належалі ў свой час да эліт. Крыніцы маюць статыстычнае паходжанне. Выбаркі найчасцей ствараюцца пры дапамозе пабудовы камп'ютарных баз даных, а вынікі іх аналізу ўяўляюць сабой шэраг лічбаў, якія адлюстроўваюць пэўную сацыяльную дынаміку. Прыхільнікі такога падыходу больш зацікаўлены ў сацыяльнай гісторыі позняга Новага часу і Найноўшага часу, хоць пры наяўнасці дастатковай колькасці неабходных крыніц ён можа паспяхова ўжывацца і ў дачыненні да іншых перыядаў [1, p. 48; 2, p. 10–11]. Цікава, што ў позняй савецкай і сучаснай расійскай гістарыяграфіі даволі доўга панаваў менавіта гэты тып прасапаграфічнага даследавання, існаванне элітарнага падыходу часам нават не прымалася да ўвагі [23].

Яшчэ адзін аспект прасапаграфіі, які патрабуе асобнага каментарыя, – гэта падвоенае разуменне яе прыроды. У сучаснай гістарыяграфіі пад прасапаграфіяй могуць разумецца асобна як база даных з пэўнай загадзя вызначанай групай асоб, так і ўласна аналітычнае даследаванне, зробленае на падставе адпаведнай базы. Пры гэтым калі першы элемент можа існаваць без другога, то другі непазбежна мусіць грунтавацца на першым, і не мае значэння, ці з'яўляецца аўтар аналітычнай часткі даследавання складальнікам прасапаграфічнай базы. Часам сэнс прасапаграфіі звужаецца выключна да першага значэння, аднак такая тэндэнцыя дастаткова востра крытыкуецца. Безумоўна, падобная падвоенасць уносіць пэўную блытаніну ў разуменне прасапаграфіі, таму зусім не дзіўна, што перыядычна гучаць заклікі ўключаць у трактоўку паняцця абодва аспекты – збіранне базы даных і наступны яе аналіз [2, p. 6; 3, p. 156–159].

З часу выхаду артыкула Л. Стоўна прасапаграфічны метад прайшоў значны шлях развіцця. З'явіўся нават падзел прасапаграфіі на традыцыйную і новую. Новая прасапаграфія ў апошнія два дзесяцігоддзі набыла значнае распаўсюджанне. Адным з яе галоўных папулярызатараў у навуковым свеце стаў факультэт лічбавай гуманітарыстыкі (*Department of digital humanities*) (раней – Цэнтр вылічэнняў у гуманітарыстыцы (*Centre for computing in the humanities*)), створаны пры Каралеўскім каледжы Лондана. Ён стаяў ля вытокаў такіх буйных праектаў, як «Прасапаграфія Візантыйскай імперыі» (*Prosopography of the Byzantine Empire*) і «Прасапаграфія Англіі англасаксонскага перыяду» (*Prosopography of Anglo-Saxon England*). Фактычна но-

вая прасапаграфія не ўяўляе сабой нейкага метадалагічнага прарыву. Яна з'яўляецца вынікам 40-гадовага развіцця дадзенага метаду, на які надзвычай моцны ўплыў аказала развіццё камп'ютарных тэхналогій. Таксама немагчыма не адзначыць сур'ёзнага змяшчэння акцэнтаў: куды большае распаўсюджанне з часам набыла масавая школа прасапаграфіі, якая натхняецца дасягненнямі сацыяльнай гісторыі і сацыялогіі. Асаблівае прызнанне сярод прасапографаў атрымала тэорыя сацыяльных палёў знакамітага французскага навукоўца П. Бурдзьё, а таксама сацыялагічная тэорыя сацыяльных сетак. Гэта найбольш распаўсюджаныя, але не адзінкавыя прыклады цікавасці прасапаграфіі да сацыялагічных метадаў [2, p. 3, 12–13, 15, 21–24; 24].

На сучасным этапе прасапаграфічны метад шырока выкарыстоўваецца гісторыкамі, якія займаюцца вывучэннем самых розных перыядаў і напрамкаў. Па-ранейшаму вялікай папулярнасцю ён карыстаецца сярод даследчыкаў палітычнай гісторыі, нягледзячы на тое, што такі падыход у гістарыяграфіі не надзелены празмернай пашанай праз выключную цікавасць да палітычных эліт. У цэнтры ўвагі гісторыкаў, якія да яго звяртаюцца, – генеалогія, бізнес-інтарэсы, палітычная актыўнасць уладных эліт. Тыповыя праблемы, вырашэнне якіх яны перад сабой ставяць, – фармальныя і нефармальныя механізмы прыняцця палітычных рашэнняў у дзяржаве, супольнасці; прынцыпы функцыянавання ўлады, інстытутаў; тыпы кар'ерных мадэлей і сацыяльнага авансу; характар і механізмы палітычных уплываў; пазаінстытуцыйныя праблемы функцыянавання дзяржаў, арганізацый, груп і г. д. Даследчыкі сацыяльнай гісторыі, зыходзячы з веры ў тое, што гістарычны працэс фарміруюць не эліты, а шырокія сацыяльныя сілы, звяртаюць увагу на праблемы іншага характару. Тыповымі даследчыцкімі мэтамі гэтых навукоўцаў можа быць вывучэнне сацыяльнай стратыфікацыі грамадства, сацыяльнай мабільнасці, складу сацыяльных груп, характару сувязей унутры сацыяльнай групы і паміж рознымі групамі, сацыяльнымі сеткамі і г. д. [4, p. 41, 46]. Развіццё прасапаграфіі на сучасным этапе, аднак, можа стаць тэмай для асобнага артыкула.

Такім чынам, за больш чым сто гадоў свайго існавання прасапаграфічны метад прайшоў значны шлях развіцця. Узнікшы ў межах гісторыі Антычнасці ў канцы XIX ст. у якасці дакладна арганізаванай працы па зборы біяграфічных звестак загадзя вызначанай групы асоб, ён перажыў у другой трэці XX ст. этап практычнага афармлення ў асобны метад вывучэння мінулага. З 1970-х гг. актыўна абмяркоўваецца тэарэтычны і метадалагічны фундамент прасапаграфіі. Пры гэтым яе папулярнасць не змяншаецца. Безумоўна, можна сцвярджаць, што ў XXI ст. прасапаграфія перажывае значны ўздым, пашыраючы тэматычна, храналагічна і геаграфічна сферу свайго выкарыстання. Айчынным гісторыкам варта ацаніць магчымасць ужывання метаду пры даследаванні актуальных праблем гісторыі Беларусі. Аднак для таго каб не заблытацца ў вялікай колькасці інтэрпрэтацый, падыходаў, тэхнік і прыёмаў, якія распаўсюдзіліся сярод даследчыкаў-прасапографаў у цяперашні час, трэба звярнуцца да яго пачаткаў, першых крокаў у яго развіцці, зробленых англасаксонскімі гісторыкамі ў другой трэці XX ст. Гэта дазволіць з усёй выразнасцю зразумець метадалагічны сэнс, сутнасць, асноўныя кірункі прасапаграфіі як метаду гістарычнага даследавання.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Stone L.* Prosopography // Daedalus. 1971. № 1 (100). P. 46–79.
2. *Keats-Rohan K. S. B.* Introduction. Chameleon or Chimera? Understanding Prosopography // Prosopography Approaches and Applications / ed. by K. S. B. Keats-Rohan. Oxford, 2007. P. 1–32.
3. *Carney T. F.* Prosopography: payoffs and pitfalls // Phoenix. 1973. No. 2 (27). P. 156–179.
4. *Verboven K., Carlier M., Dumolyn J.* A Short Manual to the Art of Prosopography // Prosopography Approaches and Applications / ed. by K. S. B. Keats-Rohan. Oxford, 2007. P. 35–69.
5. *Barnes T. D.* Prosopography Modern and Ancient // Prosopography Approaches and Applications / ed. by K. S. B. Keats-Rohan. Oxford, 2007. P. 71–82.
6. *Klebs E., Rohden P. von, Dessau H.* Prosopographia Imperii Romani Saec. I, II, III. Berolini, 1897–1898.
7. Prosopographia Imperii Romani Saec I, II, III. 2nd ed. Berlin, 1933–2015.
8. *Martindale J. R.* The prosopography of the Later Roman Empire: a memoir of the era of A. H. M. Jones' // Fifty years of prosopography: the Later Roman Empire, Byzantium and Beyond. Oxford, 2003. P. 1–10.
9. Paulys Realencyclopädie der classischen Altertumswissenschaft / eds: A. Pauly [et al.]. Stuttgart, 1894–1980.
10. Dictionary of national biography / ed. by S. Lee. London, 1900. Vol. LXIII.
11. Polski Słownik Biograficzny / red. A. Romanowski. T. 51/1. Warszawa ; Kraków, 2016.
12. *Матвейчык Д. Ч.* Удзельнікі паўстання 1863–1864 гадоў : біягр. слоўн. Мінск, 2016.
13. *Лісейчыкаў Д. В.* Святар у беларускім соцыуме: прасапаграфія ўніяцкага духавенства 1596–1839 гг. Мінск, 2015.
14. *Beard C. A.* An Economic Interpretation of the Constitution of the United States. New York, 1913.
15. *Newton A. P.* The Colonising Activities of the English puritans. New Haven, 1914.
16. *Namier L.* The Structure of Politics at the Accession of George. 2nd ed. London, 1957.
17. *Thomas P.* Review of The Structure of Politics at the Accession of George III : rev. № 32a. 1997, June. URL: http://www.history.ac.uk/reviews/review/32a (date of access: 11.02.2017).
18. *Syme R.* The Roman Revolution. Oxford, 1939.

19. *Santangelo F.* Syme, Momigliano, and a New Italian Edition of the Roman Revolution // Histos. 2014. No. 8. P. IXI–IXIII.
20. Ronald Syme, 86, Classics Scholar And Historian at Oxford, Is Dead. 1989, 7 Sept. URL: http://www.nytimes.com/1989/09/07/obituaries/ronald-syme-86-classics-scholar-and-historian-at-oxford-is-dead.html (date of access: 11.02.2017).
21. *Merton R. K.* Science, Technology and Society in Seventeenth Century England // Osiris. 1938. Vol. 4. P. 360–632.
22. *Hollander J.* Renowned Columbia Sociologist and National Science Winner Robert K. Merton Dies at 92. 25.02.2003. URL: http://www.columbia.edu/cu/news/03/02/robertKMerton.html (date of access: 11.02.2017).
23. *Юмашева Ю. Ю.* Историография просопографии // Изв. Урал. гос. ун-та. 2005. № 39. С. 95–127.
24. *Бурдье П.* Социальное пространство: поля и практики / сост., общ. ред. пер. и послесл. Н. А. Шматко. СПб. ; М., 2005.

## References

1. Stone L. Prosopography. *Daedalus*. 1971. No. 1 (100). P. 46–79.
2. Keats-Rohan K. S. B. Introduction. Chameleon or Chimera? Understanding Prosopography. *Prosopography Approaches and Applications*. Oxford, 2007. P. 1–32.
3. Carney T. F. Prosopography: payoffs and pitfalls. *Phoenix*. 1973. No. 2 (27). P. 156–179.
4. Verboven K., Carlier M., Dumolyn J. A Short Manual to the Art of Prosopography. *Prosopography Approaches and Applications*. Oxford, 2007. P. 35–69.
5. Barnes T. D. Prosopography Modern and Ancient. *Prosopography Approaches and Applications.* Oxford, 2007. P. 71–82.
6. Klebs E., Rohden P. von, Dessau H. Prosopographia Imperii Romani Saec I, II, III. Berolini, 1897–1898. Vol. 1–3 (in Lat.).
7. Prosopographia Imperii Romani Saec I, II, III. 2nd ed. Berlin, 1933–2015 (in Lat.).
8. Martindale J. R. The prosopography of the Later Roman Empire: a memoir of the era of A. H. M. Jones'. *Fifty years of prosopography: the Later Roman Empire, Byzantium and Beyond.* Oxford, 2003. P. 1–10.
9. Pauly A., Wissowa G., Kroll W., et al. (eds). Paulys Realencyclopädie der classischen Altertumswissenschaft. Stuttgart, 1894–1980 (in Germ.).
10. Lee S. (ed.). Dictionary of national biography. London, 1900. Vol. LXIII.
11. Romanowski A. (ed.). Polski Słownik Biograficzny. Warszawa ; Kraków, 2016. Vol. 51/1 (in Pol.).
12. Matveichyk D. C. [The participants of the rebellion of 1863–1864] : a biogr. dict. Minsk, 2016 (in Belarus.).
13. Liseichykau Dz. [Priest in Belarusian society: prosopograpy of the uniate clergy, 1596–1839]. Minsk, 2015 (in Belarus.).
14. Beard C. A. An Economic Interpretation of the Constitution of the United States. New York, 1913.
15. Newton A. P. The Colonising Activities of the English puritans. New Haven, 1914.
16. Namier L. The Structure of Politics at the Accession of George. 2nd ed. London, 1957.
17. Thomas P. Review of The Structure of Politics at the Accession of George III : rev. No. 32a. 1997, June. URL: http://www.history.ac.uk/reviews/review/32a (date of access: 11.02.2017).
18. Syme R. The Roman Revolution. Oxford, 1939.
19. Santangelo F. Syme, Momigliano, and a New Italian Edition of the Roman Revolution. *Histos*. 2014. No. 8. P. IXI–IXIII.
20. Ronald Syme, 86, Classics Scholar And Historian at Oxford, Is Dead. 1989, 7 Sept. URL: http://www.nytimes.com/1989/09/07/obituaries/ronald-syme-86-classics-scholar-and-historian-at-oxford-is-dead.html (date of access: 11.02.2017).
21. Merton R. K. Science, Technology and Society in Seventeenth Century England. Osiris. 1938. Vol. 4. P. 360–632.
22. Hollander J. Renowned Columbia Sociologist and National Science Winner Robert K. Merton Dies at 92. 25 Febr. 2003. URL: http://www.columbia.edu/cu/news/03/02/robertKMerton.html (date of access: 11.02.2017).
23. Yumasheva Y. Y. [Historiography of prosopography]. *Izv. Ural. gos. univ*. 2005. No. 39. P. 95–127 (in Russ.).
24. Burde P. [Social space: fields and practices]. Saint Petersburg ; Moscow, 2005.

*Артыкул пастуніў у рэдкалегію 03.04.2017.*
*Received by editorial board 03.04.2017.*